**У. В. Здановіч**

# МІЖЭТНІЧНЫЯ АДНОСІНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ (ВЕРАСЕНЬ 1939 – ВОСЕНЬ 1941 г.) У ПРАЦАХ СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ ГІСТОРЫКАЎ

У заходнебеларускім рэгіёнё, які па сваім палітычным, сацыяльна-эканамічным, канфесійным і нацыянальным становішчы істотна адрозніваўся ад астатняй тэрыторыі БССР, параўнальна мірна суіснавалі палякі, беларусы, рускія, украінцы, яўрэі, татары і літоўцы. Уступленне савецкіх войскаў на тэрыторыю Польшчы, далучэнне Заходняй Беларусі да БССР змянілі этнічную сітуацыю на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі.

Палітыка нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якая на той час праводзілася, змяшчала элементы беларусізацыі (сам тэрмін ужо не ўжываўся), што натуральна адпавядала інтарэсам большасці заходніх беларусаў. Савецкая ўлада не магла адразу пачаць русіфікацыю, бо гэта магло выклікаць незадаволенасць мясцовага насельніцтва і дэстабілізаваць і без таго складаную сацыяльна-палітычную сітуацыю.

Але адначасова пачала ажыццяўляцца палітыка дэпаланізацыі. Рэпрэсіі былі накіраваныя на падаўленне любых праяваў апазіцыі. У найбольшым маштабе рэпрэсіям падвяргалася польскае насельніцтва, якое займала прывілеяванае сацыяльнае становішча ў даваеннай Польшчы. У прыватнасці, аўтары спецыяльнага параграфа "Арышты і дэпартацыі сярод насельніцтва" ў 5-м томе 6-томнай "Гісторыі Беларусі" пішуць: "У канцы 1939 – пачатку 1940 г. была падрыхтавана і ажыццёўлена на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны буйнамаштабная карная экспедыцыя аб высяленні асаднікаў і работнікаў лясной аховы. Яна праводзілася на падставе сакрэтнай пастановы Савета Народных Камісараў Саюза ССР ад 5 снежня 1939 г. … У хуткім часе пасля дэпартацыі асаднікаў і леснікоў бальшавіцкай уладай было падрыхтавана наступнае буйнамаштабнае мерапрыемства – перамяшчэнне жыхароў населеных пунктаў 800-метровай памежнай паласы ўздоўж у заходніх абласцях БССР… Усяго, паводле прыведзеных вышэй звестак, колькасць рэпрэсаваных у заходніх абласцях БССР з верасня 1939 г. і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны склала каля 150 тыс. чалавек" [1, с. 463, 464, 465].

Раскрываючы палітыку высялення, аўтары чацвёртага тома фундаментальнай 5-томнай працы "История белорусской государственности" ўдакладняюць, што "гвалтоўнай высылцы падвяргаліся «сацыяльна чужыя», з пункту гледжання савецкай улады, катэгорыі насельніцтва: прадстаўнікі былой польскай грамадзянскай адміністрацыі, уладальнікі прадпрыемстваў, фабрык, заводаў, буйныя землеўладальнікі і памешчыкі, афіцэры Войска спецслужбаў, паліцыянты і жандары, службоўцы памежнай і лясной службы, асаднікі і члены іх сем'яў… Такім чынам, як сведчаць архіўныя і апублікаваныя крыніцы, у выніку чатырох аперацый з заходніх абласцей БССР было выслана 123 531 чалавек. Яны знаходзіліся на спецпасяленнях у 13 абласцях, 2 краях, 4 аўтаномных рэспубліках РСФСР і 8 абласцях Казахскай ССР" [2, с. 90, 91].

Нягледзячы на тое, што палітыка савецкіх уладаў не насіла ярка выяўленага антыпольскага характару і не была звязана з распальваннем міжнацыянальнага супрацьстаяння, савецкі ўрад не імкнуўся спыняць выпадкі праяўлення варожасці да польскага насельніцтва, перш за ўсё да "асаднікаў" і "чыноўнікаў". Пацвярджэнне таму мы знаходзім у 6-томнай "Гісторыі Беларусі", аўтары якой адзначаюць: "у першыя дні і нават тыдні пасля занятку Чырвонай Арміяй тэрыторыі Заходняй Беларусі прадстаўнікі савецкай улады не толькі не перашкаджалі такім самасудам, а нават падштурхоўвалі беларускіх сялян да помсты" [1, с. 453].

Узмацненню канфрантацыйных настрояў спрыялі вераснёўскія падзеі 1939 г., уступленне часцей Чырвонай Арміі на тэрыторыю Заходняй Беларусі. "Для былых польскіх грамадзян паводзіны большай часткі беларускага насельніцтва, якое радасна сустракала вызваліцеляў, стала актам здрады, бо, з пункту гледжання польскай дзяржавы, этнічныя меншасці павінны былі нароўні з палякамі змагацца супраць абодвух акупантаў – III рэйха і СССР, – таму беларусы пачынаючы з 1939 г. станавіліся аб'ектам нападак і пагроз" [3].

На этнапалітычныя працэсы ў заходніх абласцях Беларусі аказвалі ўплыў "асаднікі" – лаяльныя ўладам палякі, якія ў міжваенны перыяд атрымлівалі зямлю і ключавыя адміністрацыйныя пасады ў разгляданым рэгіёне, і "ўсходнікі" – савецкія і партыйныя служачыя, накіраваныя сюды на працу. Менавіта "ўсходнікі", якія павінны былі масава замяшчаць штаты міліцыі, органаў правасуддзя і бяспекі, былі носьбітамі дамінуючай ідэалогіі.

Як сведчаць разнастайныя крыніцы, нягледзячы на прыналежнасць да беларускага этнасу, для мясцовага насельніцтва "ўсходнікі" засталіся чужым элементам. У шэрагу выпадкаў, адзначаюць аўтары чацвёртага тома фундаментальнай 5-томнай працы "История белорусской государственности", "работнікі, якія прыехалі ў заходнія вобласці БССР з Усходу, заводзілі свае парадкі, ігнаравалі мясцовы вобраз жыцця, традыцыі насельніцтва"[2, с. 89].

Гэтаму спрыяла і палітыка савецкай улады, у аснове якой былі не нацыянальнасць ці рэлігія, а класавы падыход. Зыходзячы з ідэалагічных матываў, выклікаючы недавер да былых грамадзян буржуазнай дзяржавы, улада пачала "ўмацоўваць кадры" выхадцамі з Усходняй Беларусі.

Палітыка "саветызацыі" абвастрыла адносіны мясцовага насельніцтва, у першую чаргу польскага, да прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці. Так, Я. С. Разенблат лічыць, што пры правядзенні нацыянальнай палітыкі ў азначаным рэгіёне "з'яўляліся дыскрымінуемыя этнічныя групы, якія падвяргаліся праследам па нацыянальнай прыкмеце. У ходзе саветызацыі з Заходняй Беларусі былі дэпартаваны класавыя ворагі і непажаданыя элементы (уцекачы), што па сутнасці з'яўлялася этнічнымі чысткамі (паколькі рэпрэсаванымі апынуліся ў асноўнай масе палякі і яўрэі)" [4, s. 294]. У наступным артыкуле "Западные области Белоруссии в 1939–1941 годах: оккупация – воссоединение – советизация" чытаем: "адносіны паміж этнічнымі групамі, у першую чаргу паміж палякамі і яўрэямі, пачалі набываць канфліктны характар... Тым больш, што дзейнічала палітыка падвойных стандартаў, і палякі адчувалі пагрозу сваёй этнічнай бяспецы як з боку савецкай дзяржавы, так і з боку мясцовага насельніцтва. Адаптацыя палякаў да гэтай сітуацыі была балючай, рэакцыяй на яе стала гіпербалізацыя этнічнай свядомасці, а гіперідэнтычнасць заўсёды павялічвае ўзровень інталерантнасці ў міжэтнічных установках. Зніжэнне этнаталерантнасці прывяло да замацавання негатыўных этнастэрэатыпаў у адносінах да яўрэйскага і часткова беларускага насельніцтва…, як гэта захавалася ў гістарычнай памяці палякаў… Падзеі 1939–1941 гг. спрыялі павелічэнню псіхакультурнай этнічнай дыстанцыі паміж палякамі з аднаго боку і яўрэямі і беларусамі – з другога боку, што мае пэўныя водгукі і на сучасным этапе развіцця міжэтнічных і міждзяржаўных адносін" [5, с. 59–61].

З такой пазіцыяй не пагаджаюцца аўтары двухтомнага выдання "Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.". Аналізуючы нацыянальную палітыку новай улады, канцэнтруючы ўвагу пераважна на поспехах праведзеных мерапрыемстваў, яны падкрэсліваюць, што "кіраўніцтва СССР і БССР імкнулася ўлічваць нацыянальныя асаблівасці заходняга рэгіёна. З гэтай мэтай адкрываліся нацыянальна-культурныя ўстановы на польскай і яўрэйскай мовах, выходзілі газеты на польскай мове, працавалі рэдакцыі польскага радыёвяшчання" [6, с. 34].

Практычна аднолькавымі словамі характырызуюць нацыянальную палітыку ў рэгіёне і аўтары чацвёртага тома фундаментальнай 5-томнай працы "История белорусской государственности" [2, с. 89].

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны і хуткая акупацыя Заходняй Беларусі яшчэ больш ускладнілі міжнацыянальныя адносіны ў рэгіёне. На акупаванай нацыстамі тэрыторыі склалася сітуацыя, калі прыналежнасць да таго ці іншага этнасу стала ўмовай выжывання. Мясцовае насельніцтва імкнулася да аб'яднання, у той час як новыя жыхары – польскія "асаднікі", савецкія "усходнікі", нямецкая адміністрацыя – імкнуліся да распаўсюджвання ў рэгіёне светапогляду таго дзяржаўнага ўтварэння, у складзе якога аказвалася тэрыторыя.

На абвастрэнне міжэтнічных адносін была накіравана і палітыка германскіх улад, якія карысталіся вядомым са старажытнасці прынцыпам размежавання нацыянальных супольнасцяў, што пражывалі ў рэгіёне, стварэння паміж імі напружаных варожых адносін. Асабліва абвастрыліся беларуска-польскія адносіны, выкліканыя зменлівай палітыкай акупантаў, якая мянялася ад падтрымкі прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці да падтрымкі беларусаў. Як адзначаюць аўтары двухтомніка "Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг." "нацысцкая палітыка ў польскім пытанні на акупаванай тэрыторыі Беларусі была складанай і мудрагелістай" [6, с. 142].

У першыя месяцы нямецкай акупацыі адбыліся чысткі сярод беларускага насельніцтва. У першую чаргу, новая адміністрацыя была арыентавана на знішчэнне камуністычнага актыву і перакананых прыхільнікаў савецкай улады. Гэтыя задачы дэтэрмінавалі шырокае прыцягненне польскага насельніцтва да кіравання на беларускіх тэрыторыях. Праводзячы такую палітыку, нямецкія ваенныя ўлады таксама хацелі знайсці апору для сябе ў заможных пластах польскага насельніцтва, ствараючы пры гэтым ўнутрынацыянальны канфлікт сярод палякаў. Як піша, Я. Ф. Калубовіч, адзін з дзеячаў Беларускай цэнтральнай рады, калабарацыянісцкай адміністрацыі, створанай нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў прапагандысцкіх мэтах: "У шмат якіх месцах на змену бальшавікам прыйшлі не немцы, а ізноў палякі, якім удалося ўтрымацца на гэтай тэрыторыі пры савецкай уладзе. Нямецкім ваенным уладам патрэбны былі людзі, якія ведаюць мясцовыя ўмовы, для апарата самакіравання. Палякі гэтыя ўмовы ведалі і, акрамя таго, мелі амаль увесь адміністрацыйны апарат гатовым" [7, с. 21].

Нацыянальныя супярэчнасці праявіліся і падчас пастаўкі рабочай сілы ў Германію. "У залежнасці ад таго, кім былі прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі, – падкрэсліваюць аўтары манаграфіі "Вяртанне ў рабства", – на прымусовую працу адпраўляліся прадстаўнікі варожага этнасу" [8 , с. 261].

Нацыянальная палітыка В. Кубэ з восені 1941 г. набыла адваротны характар і заключалася ў падтрымцы беларусаў. Нягледзячы на тактычныя змены на розных этапах, у цэлым мерапрыемствы германскіх улад садзейнічалі абвастрэнню беларуска-польскіх адносін. Яшчэ больш канфліктны

характар яны набылі на тэрыторыі заходніх рэгіёнаў Гродзеншчыны, якія былі далучаны да асобай акругі "Беласток" і ўключаны ў склад Усходняй Прусіі. У адпаведнасці з планамі нямецкай адміністрацыі тэрыторыю планавалася "анямечыць" і інкарпараваць у Трэці рэйх, таму што яна, на думку кіраўніцтва Германіі, не з'яўлялася ні польскай, ні беларускай, але выключна германскай. Рэалізацыі дадзенага плана садзейнічала і ўвядзенне на тэрыторыі Гродзеншчыны дзвюх афіцыйных моў – нямецкай і беларускай. Разам з тым першапачаткова аналагічны статус захоўвала і польская мова. Як адзначае Я. Ф. Калубовіч, нямецкае камандаванне скарысталася палякамі, якія, ведаючы мясцовыя ўмовы і адміністрацыйны апарат, прапанавалі акупантам свае паслугі [7, с. 15, 21].

У цэлым у перыяд нацысцкай акупацыі адкрытых сутыкненняў паміж палякамі і беларусамі на тэрыторыі не адбывалася, але пэўная міжэтнічная напружанасць існавала. Тым не менш, нягледзячы на азначаныя акалічнасці, супрацьстаянне паміж прадстаўнікамі польскай і беларускай нацыянальнасцей не набыло такога крывавага канфлікту, як паміж палякамі і ўкраінцамі, які дасягнуў свайго піку 11 ліпеня 1943 г., калі адначасова было атакавана больш за 150 польскіх населеных пунктаў на тэрыторыі Валыні.

На тэрыторыі большай часткі Брэсцкай, Пінскай і часткова Палескай абласцей Беларусі, якія згодна з новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам увайшлі ў склад рэйхскамісарыята "Украіна", абвастрыліся адносіны паміж украінцамі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Гэта ў значнай ступені было выклікана акупацыйнай нацыянальнай палітыкай, накіраванай на ўкраінізацыю дадзеных тэрыторый. Так, у Брэсце дзяржаўнымі мовамі ў горадзе былі аб'яўлены нямецкая і ўкраінская. Украінізацыі павінны былі садзейнічаць і мерапрыемствы ў галіне адукацыі, асабліва газета на ўкраінскай мове "Наше слова" – друкаваны орган Брэсцкага акружнога камісарыята.

Праводзячы ідэалагічную апрацоўку украінцаў, гітлераўцы сцвярджалі, што галоўныя ворагі ўкраінцаў – гэта "маскалі", што ўкраінцы вышэй за рускіх, так як яны нібыта перажылі жыватворны ўплыў арыйскай расы ў Сярэднія вякі. Для ваеннапалонных украінцаў усталёўваўся больш мяккі рэжым, а частка іх была ў пачатку вайны вызвалена з палону і адпушчана дахаты. Беларусам гітлераўская прапаганда імкнулася даказаць, што іх ворагі рускія, якія эксплуатавалі беларусаў, а таксама палякі і яўрэі. Таму шчаслівая будучыня Беларусі, згодна з гітлераўскай прапагандай, магла быць толькі пад абаронай Германіі і пры ўмове ўдзелу беларусаў у барацьбе супраць савецкага партызанскага руху.

Аднак, як адзначае беларускі даследчык В. В. Барабаш, "гуляючы на існаваўшых міжнацыянальных супярэчнасцях, гітлераўцам удалося справакаваць канфлікты паміж украінцамі і палякамі ў асобных раёнах Беларусі, далучаных да рэйхскамісарыята «Украіна», і паміж літоўцамі і палякамі ў паўночназаходніх раёнах Беларусі, якія адышлі да генеральнай акругі «Літва». Разам з тым былі асуджаныя на няўдачу актыўныя спробы фашыстаў

распаліць буйнамаштабную вайну паміж палякамі і беларусамі. Польскае насельніцтва Беларусі на працягу ваенных гадоў усё больш актыўна ўключалася ў барацьбу з акупантамі ў шэрагах савецкіх антыфашыстаў” [9, с. 14].

Падводзячы вынік, трэба сказаць, што ў незалежнай Беларусі прадметам даследавання сталі характар нацыянальнай палітыкі, якую праводзіла савецкая ўлада на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі восенню 1939–восенню 1941 гг., міжнацыянальныя супярэчнасці. На этнапалітычныя працэсы аказвалі ўплыў “асаднікі” – лаяльныя ўладам палякі, якія ў міжваенны перыяд атрымлівалі зямлю і ключавыя адміністрацыйныя пасады ў разглядавым рэгіёне, і “ўсходнікі” – савецкія і партыйныя служачыя, накіраваныя сюды на працу. Матэрыял, які змяшчаецца ў працах, сведчыць, што адносіны паміж польскім і беларускім насельніцтвам у азначаны перыяд абвастрыліся, а ў некаторых апектах узаемадзеяння ў адміністрацыйнай сферы выліліся ў адкрытае супрацьстаянне. Канфрантацыйны характар у адносінах палякаў (тытульнага этнасу ў Польскай дзяржаве, аднак які знаходзіцца ў заходнебеларускіх землях у колькаснай меншасці) і беларусаў (карэннай большасці насельніцтва) не ўдалося пераадолець.

Міжнацыянальныя адносіны на акупаванай нацыстамі тэрыторыі Заходняй Беларусі шмат у чым вызначаліся палітыкай акупацыйных уладаў, якая ў значнай ступені залежала ад падзей на франтах вайны і спалучала ў сабе імкненне да падштурхоўвання міжнацыянальных канфліктаў і тактыку палітычнай ізаляцыі, недапушчэнне самастойнага нацыянальнага ўплыву на акупаваных тэрыторыях. Пацвярджэннем таму служыць падзел беларускіх зямель і перадача іх у розныя акупацыйныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, у якіх праводзілася розная нацыянальная палітыка. Аднак і гэтая палітыка акупантаў пацярпела крах.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.

2. История белорусской государственности : в 5 т. / А. А. Коваленя [и др.] ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2018–2020. – Т. 4 : Белорусская государственность накануне и в период Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления (1939–1953 гг.). – 2019. – 567 с.

3. *Маркелов, Н. А.* «Полонизация» и «советизация» Западной Белоруссии: сравнительный анализ политики ассимиляции и интеграции / Н. А. Маркелов // Вестн. МГИМО-Университета. – 2017. – № 6. – С. 64–74.

4. *Розенблат, Е. С.* «Контактные зоны» межэтнических отношений в Западной Беларуси. 1939–1944 гг. / Е. С. Розенблат // Polacy – Żydzi – Białorusini – Litwini na północno-wschodnich ziemiach Polski a władza radziecka (1939–1944): W kręgu mifów i stereotypów / red. nauk. M. Gnatowski, D. Boćkowski. – Białystok, 2005. – S. 291–305.

5. *Розенблат, Е. С.* Западные области Белоруссии в 1939–1941 годах: оккупация – воссоединение – советизация / Е. С. Розенблат // Западная Белоруссия и Западная Украина в 1939–1941 гг.: люди, события, документы / Ин-т славяноведения РАН ; ред. О. В. Петровская, Е. Ю. Борисенок. – СПб. : Алетейя, 2014. – С. 42–61.

6. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2014. – Кн. 2. – 335 с.

7. Под немцами. Воспоминания, свидетельства, документы : ист.-док. сб. / сост. К. М. Александров. – СПб. : Скрипториум, 2011. – 608 с.

8. *Літвін, А. М.* Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі (1941–1945 гг.) / А. М. Літвін, Я. А. Грэбень, С. Я. Новікаў ; агул. рэд. А. М. Літвіна. – Мінск : Тэсей, 2010. – 584 с.

9. *Барабаш, В. В.* Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.) / В. В. Барабаш. – Гродно : ГрГУ, 1998. – 146 с.